УДК (070 + 94) (476) "15/16"

# РЭАКУПАЦЫЯ СМАЛЕНСКА 1633–1634 гг. У ПОЛЬСКАМОЎНЫХ ДАКУМЕНТАХ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XVII ст.

Еўмянькоў Віталь Іванавіч
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова",
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь);

Юрчанка Марыя Дзмітрыеўна
студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта ўстановы
адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова"
(г. Магілёў, Беларусь)

*Разглядаюцца арыгінальныя дакументы перыяду панавання Уладзіслава IV у кантэксце гісторыі зняцця аблогі са Смаленска ў 1634 г.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1634 г. з'явіліся наступныя дакументы: "Новая песня, або Трыумф маскоўскі" ("NOWA PIESN. Abo TRYVMPH MOSKIEWSKI") і "Навіна з Масквы праўдзівая, кароткім вершам выкладзеная…" ("WIESC Z MOSKWY PRAWDZIWA. Krotkim HENRYKA CHELCHOWSKIEGO Rymem Wyprowadzona. Roku Pańskiego M.DC.XXXIIII. W THORUNIU, Apud Franciscum Schnellboltz"). Першы дакумент можна лічыць паэтычнай дэкларацыяй паспяховага маскоўскага паходу толькі што абранага караля; другі – паэтычным дыярыушам гісторыі рэакупацыі Смаленшчыны. Невядомы аўтар "Новай песні" прадэманстраваў відавочны паэтычны талент, аднак не быў шчодры на інфармацыю. Гэты дакумент выконваў, хутчэй за ўсё, выключна ідэалагічную функцыю: даводзіў да рэцыпіента тое, што Уладзіслаў узяў у спадчыну ад свайго бацькі найбольш паспяховыя прыёмы вырашэння знешнепалітычных праблем.

Аўтар другога дакумента – вядомы польскі паэт эпохі Барока Генрык Чэлхоўскі / Henryk Chelchowski – наадварот, праявіў добрую абазнанасць у дэталях той ваеннай кампаніі, што сведчыць, на наш погляд, пра яго непасрэдны ўдзел у паходзе. Варта тут згадаць і тое, што Г. Чэлхоўскі вынес на тытул свайго выдання слова "навіна", дадаўшы тое, што яна "праўдзівая".

Пачынаецца "Новая песня…" са звароту да "Кароны польскай": "Славутая Карона польская! Ты нязломная! // Слухай навіны, да цябе прыйшлі яны // З маскоўскіх лясоў, ад караля твайго // Уладзіслава зацнага".

Гутарка тут, відавочна, пра падзеі, якія распачаліся адразу пасля смерці Жыгімонта III Вазы (19 красавіка 1632 г.). Вялікі князь маскоўскі Міхаіл Фёдаравіч Раманаў разарваў мір з Рэччу Паспалітай, мяркуючы, што смерць караля – гэта і канец перамір'я. "Думалі яны [маскоўцы. – *В.Е.*], што пры абранні новага караля на соймах праміне шмат часу, і Рэч Паспалітая не здолее сабраць дастаткова сіл, каб паспяхова весці вайну. Меў жа ён [Міхаіл Фёдаравіч. – *В.Е.*] шмат часу, каб набрацца моцы і быць здольным да нападу на суседні народ, мужны пры патрэбе, але менш падрыхтаваны да вайны. Уварваліся войскі па загадзе князя ў польскія межы пад камандаваннем Міхаіла Барысавіча Шэйна і Сямёна Васільевіча Празароўскага. Было іх каля 100 тысяч, з іх 70 тысяч – маскавіты, 30 тысяч – найміты з розных краёў" [1, с. 56].

М.Б. Шэйн "Смаленск прымушаў здацца", пачынаючы з 14 лістапада 1632 года [1, с. 53]. Уладзіслаў IV прыбыў у абоз польска-літоўскага войска толькі 2 верасня 1633 года [1, с. 60]. І гэта пры тым, што каранацыйны сойм завяршыўся 17 сакавіка 1633 года [1, с. 53]. Паміж каранацыяй (6 лютага

1633 г.) і з’яўленнем Уладзіслава на вайну прайшло амаль палова года. Таму заўвага аўтара адносна таго, што кароль нібыта дужа спяшаўся бараніць край (“Толькі што на галаву ўздзеў ён цябе, // І дзеля абароны тваёй не шкадуе сябе”) уяўляецца нам залішне катэгарычнай. Вось што на гэты конт у сваім дыярыушы паведамляе Альбрэхт Радзівіл: “Праз цэлы той месяц [жнівень. – *В.Е.*] лянівым крокам рухаўся кароль у бок Смаленска” [2, с. 171].

Праўда, тут трэба згадаць тыповыя праблемы, з якімі сутыкнуўся кароль, – нежаданне кварцянога войска ісці на вайну без выплачанага яму жолда, бунты запарожцаў і пратэсты так званых дысідэнтаў, пастаянная пагроза на поўдні, дзе даводзілася трымаць войска на чале з вялікім каронным гетманам Станіславам Канецпольскім. Затрымка Уладзіслава хутчэй за ўсё была звязана з вырашэннем гэтых надзённых праблем. Ды і па дарозе ў Смаленск жаўнеры карысталіся не бітымі шляхамі, як піша ўсё той жа А. Радзівіл, а пакручастымі сцяжынкамі, якія вялі да шляхецкіх засценкаў і вёсак – словам, туды, дзе можна было пажывіцца, сплаціўшы належнае праву моцнага.

Дзіўна тут тое, што аўтар “Новай песні…” ні словам не згадаў вялікага гетмана літоўскага і Віленскага ваяводу Крыштофа Радзівіла, які паспяхова ваяваў з Шэйнам ужо з палову года. “Гетман літоўскі ўжо некалькі месяцаў ляжаў абозам пад Красным і часта шчасліва пляжыў маскалёў. Аднойчы яго палкоўнік Мікалай Абрахамавіч на значны аддзел маскоўскі з флангу ўдарыў і каля 3 тысяч трупаў варожых на полі пакінуў” [1, с. 60]. Прычын для адсутнасці імя Радзівіла ў тэксце можа быць некалькі – ад нежадання Уладзіслава дзяліць перамогу з літвінамі да спрацоўвання старой, вядомай яшчэ з часоў Жыгімонта ІІІ, прыкрай для Літвы традыцыі – не заўважаць “недаверка” Радзівіла які б годны ўчынак той не зрабіў. Не варта забывацца таксама на ўдзел Крыштофа Радзівіла ў падтрымцы, арганізаванай Янушам Радзівілам, так званага рокаша Зэбжэдоўскага. Рэха тых падзей, канешне, даляцела да Уладзіслава і балюча адбілася ў свядомасці будучага караля.

Аўтар “Новай песні…” дастаткова хутка пераскоквае з адной падзеі на іншую, пакідаючы па-за ўвагай тыя акалічнасці, якія, на яго думку, з’яўляюцца малаістотнымі. Так, ён прапускае важныя падзеі паміж пачаткам верасня 1633 г. і канцом студзеня наступнага, 1634 года. Акцэнт робіцца на тым моманце, калі М.Б. Шэйн фактычна пачаў весці з Уладзіславам IV перамовы аб капітуляцыі (пачатак гэтых перамоў – 29 студзеня 1634 г.). Працытуем яшчэ некалькі радкоў: “Масквіцін не ведаў, як яму ратавацца. // Ад штурмаў штодзённых мусіў адбівацца. // Здрадлівы Шэйн з лямантам рукі ўзносіць, // Аб перамір’і просіць. // Просіць, каб толькі пусцілі”.

Што ж адбылося за 5 месяцаў, якія аўтар “Новай песні…” вырашыў абмінуць? Перадусім, варта тут згадаць крытычнае становішча смаленскага гарнізона, які налічваў усяго дзве тысячы чатырыста чалавек. Гарнізон не меў дастаткова ні правіянту, ні пораху і мусіў бараніць старыя, дзе-нідзе далёкія ад належнай трываласці смаленскія сцены. Да таго ж, М.Б. Шэйн не проста асадзіў горад, ён апаясаў яго складанымі інжынернымі прыстасаваннямі, акопамі, шанцамі – так, што нават падысці да Смаленска было цяжка. Польскія гісторыкі згадваюць гераізм аднаго жаўнера, хутчэй за ўсё з мясцовых, якому ўдалося нейкім цудам праслізнуць у горад і перадаць камандуючаму гарнізонам Сакалінскаму каралеўскі загад трымаць абарону.

Г. Чэлхоўскі называе імя героя – Спандоўскі / Spondowski. Нібыта жаўнер, інфармуе “Навіна…”, пачуў у сне голас Бога, які загадаў смела ісці ў Смаленск. Апроч іншага, аўтар “Новай песні…” ні словам не згадаў канфлікт паміж Крыштофам Радзівілам і смаленскім ваяводам Гансеўскім. Г. Чэлхоўскі пра гэты канфлікт згадвае толькі ўскосна – віленскі і смаленскі ваяводы на пачатку “Навіны…” прапаноўваюць каралю розныя месцы для заснавання абоза. Між тым, узаемная варожасць гэтых літвінаў была настолькі моцная, што каралю давялося раздзяліць войска, каб вывесці Гансеўскага з-пад начальства Радзівіла. Апошні атрымаў большую частку жаўнераў, меншая стала пад каманду польнага гетмана кароннага Марціна Казаноўскага.

Працэс рэакупацыі Северскага ваяводства не быў гэтакай лёгкай прагулянкай для войска Рэчы Паспалітай, як вынікае гэта са зместу “Новай песні…”. Маскавіты доўга рыхтаваліся да вайны, мелі вялікія рэзервы і вялікую матывацыю – Смаленск лічылі сваёй, несправядліва адарванай тэрыторыяй. Не варта забывацца і на вялікую колькасць у маскоўскім войску еўрапейскіх наймітаў, у тым ліку нямецкіх “майстроў гарматных спраў”. У той жа час, Уладзіслаў не аднойчы скардзіўся на крытычны недахоп такіх спецыялістаў ва ўласным войску.

Тым не менш, фартуна была ўсё ж на баку Рэчы Паспалітай. 7 верасня Радзівіл у неспадзяваным месцы пераходзіць праз Днепр і атакуе маскоўскія пазіцыі на ўзгорку, які меў назву “Пакравы”. Займаў тыя пазіцыі аддзел немцаў на чале з генералам Мацісанам. Адначасова лагер Шэйна атакавалі прускія пехацінцы на чале з Оберштэрам, а лагер Празароўскага атачылі аддзелы Гансеўскага і Казаноўскага. Распачалася запеклая бітва.

Паўстала тады масква ў мужнай справе
У акопах, на шанцах, на зялёнай мураве.
Каляровых мундзіраў, нямецкай пяхоты
Тут мала! Ды шмат тут жаўнерскае цноты. <…>
Рыцары з роты пана Камянецкага
Многа набілі люду маскоўскага.
Прыгожа яны іх мячамі свянцілі,
Праўда, і самі крывёй заплацілі.

Атака Крыштофа Радзівіла была настолькі магутнай, што ледзь не з першых хвілін літвінам і запарожскім казакам удалося адсунуць ворага назад, разарваць яго абарону. Дапамагла і смаленская залога. Колькі соцень вершнікаў на чале з заступнікам камандуючага гарнізонам Станіславам Ваяводскім выйшлі з брамаў і скінулі маскавітаў з моста, забраўшы дзве гарматы. “<…> шмат ворагаў трупам паклалі, праўда і самі тры сотні страцілі” [1, с. 63]. Самы галоўны вынік гэтай сумеснай атакі: у Смаленск увайшоў асабісты полк Яна Казіміра на чале з Дэнгофам, прывёзшы правіянт і порах. Вось як момант частковага зняцця аблогі са Смаленска падае Г. Чэлхоўскі:

Шмат людзей з цвердзі прыбывала,
Пана свайго радасна прывітала.
Да ног мілажальна схіляліся.
К.Я.М. тая ўдзячнасць падабалася –
Шмат, каго пацалаваў, чула абняў,
Ласкавага слова не пашкадаваў.

Не былі гэтакімі паспяховымі спробы здабыць маскоўскі лагер з боку польнага гетмана кароннага. Маючы вялікае жаданне перамагчы, Марцін Казаноўскі абрынуўся на маскавітаў і сам не заўважыў як патрапіў у пастку. Вынік – шмат забітых. Вось што пра тыя падзеі піша Альбрэхт Радзівіл: “Гетмана кароннага [Марцін Казаноўскі. – *В.Е.*] напаткаў іншы лёс. Шмат нашых на засаду варожую напаролася і загінула. 160 у няволю патрапіла. Шэмет, зацны маладзён, палёг, і Вілчыньскі, суддзя зямлі смаленскай, загінуў. Гетман у вялікім замяшанні мусіў адступіць” [2, с. 173].

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Kwiatkowski, K. Dzieje narodu polskiego za panowania Władysława IV. Krola polskiego i szweckiego / K. Kwiatkowski. – Warszawa: nakładem i drukiem N. Glücksberga, 1823. – 476 s.
2. Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litewskiego / Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. – T. 1. – W Poznaniu : u braci Scherków, 1839. – 435 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова